падабраны разнастайны дыдактычны матэрыял, уключаны спецыяльныя заданні. Шмат увагі надаецца адпрацоўцы вымаўлення адметных гукаў беларускай мовы [ч], [дз'], [ц'] і інш.

Практыкаванні насычаны заданнямі, накіраванымі на ўдакладненне, узбагачэнне і актывізацыю слоўнікавага запасу вучняў, утрымліваюць матэрыял для мадэлявання выказванняў на аснове апорных слоў і словазлучэнняў. Змест практыкаванняў арыентуе на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў безэквівалентнай лексікай (*апоўдні, бра́ткі, бярозавік, вырай, зацірка* і інш.), устойлівымі выразамі, прыказкамі і прымаўкамі. Значную дапамогу ў фарміраванні актыўнага лексікону ў вучняў будзе аказваць выкарыстанне тлумачальнага слоўніка, змешчанага ў канцы вучэбнага дапаможніка, дзе падаюцца значэнні слоў, пазначаных у тэксце зорачкай. Вучні не толькі даведаюцца пра значэнне невядомага слова, але і авалодаюць уменнем карыстацца тлумачальным слоўнікам.

Прапануецца праца з дэфармаванымі сказамі і тэкстамі. Напрыклад, вучням неабходна размясціць часткі тэксту ў патрэбнай паслядоўнасці. Усё гэта рыхтуе да навучання пераказу, чаму нададзена асаблівая ўвага ў змесце і структуры вучэбнага дапаможніка. Сістэмна падаюцца практыкаванні, у якіх патрабуецца падзяліць тэкст на часткі, сфармуляваць пытанні па змесце ці адказваць на іх, у тым ліку пісьмова. Для паступовай падрыхтоўкі вучняў да пераказу ў практыкаваннях даюцца заданні вусна пераказаць тэкст ці частку тэксту пасля адпаведнай метадычнай работы.

Змест вучэбнага дапаможніка накіраваны на авалоданне *лінгвакультуралагічнай* і *сацыякультурнай кампетэнцыямі*. У тэкстах падаецца інфармацыя пра беларускія сімвалы (зубр, лён, бульба). Падабраны і састаўлены цікавыя тэксты пра беларускія народныя святы (Дажынкі, Каляды, Масленіца, Гуканне вясны), Нацыянальную бібліятэку Беларусі, першы лялечны тэатр на Беларусі — батлейку, беларускія ручнікі, розныя куткі Беларусі (вёска Ляўкі, возера Нарач), пра рэчы, якімі карысталіся людзі раней (збан, куфар) і інш. Вучні даведаюцца пра паходжанне беларускіх назваў месяцаў — верасень, кастрычнік, лістапад, сакавік. Прадугледжана засваенне правіл маўленчага этыкету, авалоданне сацыяльнымі нормамі маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін; фарміраванне ўважлівага стаўлення да беларускага слова.

Матэрыял вучэбнага дапаможніка скіраваны на *фарміраванне функцыянальнай граматнасці*, вынікам якой з'яўляецца авалоданне вучнямі сістэмай ключавых кампетэнцый, фарміраванне ўніверсальных вучэбных дзеянняў. Фармулёўкі заданняў і структура практыкаванняў накіраваны на авалоданне *пазнавальнымі, рэгулятыўнымі, інфармацыйна-камунікатыўнымі* уменнямі. Метапрадметныя вынікі будуць забяспечваць авалоданне вучнямі ключавымі кампетэнцыямі, што складаюць аснову ўмення вучыцца.

---

***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.***, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Урокі 1–9 змешчаны ў электронным дадатку да часопіса.*

### Урок* 10. Абазначэнне літарамі *е, ё, ю, я, і* галосных гукаў і мяккасці зычных гукаў

***Мэты ўрока:*** актуалізаваць веды пра ролю літар ***е, ё, ю, я, і***; фарміраваць уменне правільна абазначаць галосныя гукі літарамі на пісьме, вызначаць літары, якія ўказваюць на мяккасць зычных гукаў; развіваць фанематычны слых; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; развіваць уменне фармуляваць пытанні да кожнай часткі тэксту, вусна пераказваць тэкст; выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, літары, наборнае палатно, карткі са складамі *бя, нё, зю, пі, гі*; малюнак, на якім адлюстравана краска; карткі з лічбамі 1, 2, 3 для арганізацыі групавой работы.

---

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка знаходзяць алфавіт на форзацы 1 вучэбнага дапаможніка і выконваюць заданні, накіраваныя на ўзнаўленне алфавіту, у тым ліку са словамі, якія пачынаюцца з аднолькавых літар. Потым выклікаюцца вучні і атрымліваюць карткі ад 1 да 6. Ім трэба запісаць на дошцы слова, якое ідзе пад гэтым нумарам у выкананым імі дамашнім заданні.

***Практыкаванне 43.***

Выкананне практыкавання правяраецца франтальна. Вучні выразна чытаюць верш і адказваюць на пытанні: «З чаго будуецца дом? З чаго складваюцца словы? З літар складаюцца словы вуснай ці пісьмовай мовы? Які дзіўны свет можна адкрыць з дапамогай літар, слоў? Назавіце словы, якія размяшчалі ў алфавітным парадку. Як бы вы размясцілі гэтыя словы па ступені значнасці? Растлумачце».

Пасля адказу на пытанні правяраецца выкананне задання на дошцы. Вучні каля дошкі па парадку называюць словы ў алфавітным парадку, астатнія навучэнцы сігналізуюць пра правільнасць выканання задання. Настаўнік прапануе вучням назваць у гэтых словах літары, якія абазначаюць галосныя гукі, і выстаўляе іх на наборнае палатно.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Вучні называюць літары галосных гукаў, выстаўленыя на наборным палатне, і па заданні настаўніка вызначаюць лішнюю літару, тлумачаць свой выбар: «Лішняя літара ***е***, таму што яна абазначае гук [э] і мяккасць зычнага гука». Настаўнік раскрывае тайну, што такія літары і стануць гераінямі гэтага ўрока. Фармулюецца тэма: «Літары, якія абазначаюць галосныя гукі і мяккасць зычных гукаў».

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на праблемную сітуацыю (с. 32–33) і прапануе самастойна яе прачытаць. Настаўнік просіць вучняў абмеркаваць з суседам па парце «па сакрэце», што пераблытаў Чамучык. Далей арганізуе гутарку па пытаннях: «Якое заданне выконваў Чамучык? Што Чамучык не зразумеў? Што ён пераблытаў? Колькі галосных гукаў? Якія літары яны абазначаюць?» У якасці апоры для адказаў вучні могуць выкарыстаць алфавіт і стужку літар (форзац 1). Вынікам гутаркі становіцца замацаванне на наборным палатне адпаведных кожнаму галоснаму гуку літар. Вучні спрабуюць адказаць, чаму колькасць галосных гукаў і літар, якія іх абазначаюць, не супадае.

***Практыкаванне 44.***

Вучні называюць пары складоў і тлумачаць розніцу ва ўжыванні літар, якія абазначаюць галосныя гукі. Магчыма арганізаваць работу ў парах у выглядзе гульні. Адзін вучань называе склад, другі падбірае яму пару і наадварот. Потым самастойна запісваюць склады, у якіх галосны гук указвае на мяккасць зычнага гука. Праверка выканання задання адбываецца праз замацаванне складоў на дошцы вучнямі і самаправерку запісанага. Навучэнцы прапануюць словы, у якіх ёсць адпаведныя склады.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік перад чытаннем правіла задае вучням два пытанні, на якія яны павінны адказаць (пытанні запісаны на дошцы): «Якія літары абазначаюць галосны гук і ўказваюць на мяккасць зычнага? Якія гукі абазначаюць гэтыя літары?»

Настаўнік чытае правіла, дае вучням магчымасць адказаць на пытанні і запісаць правільныя адказы на дошцы.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 45.***

Выкананне практыкавання лепш пачаць з другой пары слоў, таму што яны больш простыя для разумення вучнямі.

— Якія літары прапануецца дадаць у словы? Якая літара абазначае мяккасць зычнага гука? Якія словы атрымаліся?

Вучні запісваюць словы з каменціраваннем. Падкрэсліваюць літару, якая ўказвае на мяккасць зычнага гука. Аналагічна выконваюцца астатнія варыянты пар слоў. Трэба звярнуць увагу вучняў на значэнне слова *ла́сы* — вельмі смачны, ахвочы да чаго-небудзь, мэтазгодна паставіць у ім націск.

Прапедэўтычнае заданне на дыферэнцыяцыю слоў па лексіка-граматычным значэнні выконваецца вусна па наступным узоры: «На пытанне *хто?* адказвае слова *сыны*. *Хто? Сыны*» Аналагічна тлумачацца іншыя словы.

Работа з практыкаваннем завяршаецца падвядзеннем выніку: «Якія літары абазначаюць галосны гук і абазначаюць мяккасць зычнага гука?»

***Практыкаванне 46.***

Выкананне практыкавання пачынаецца з прачытання прыказак і абмену думкамі пра іх сэнс. Сэнс першай прыказкі *Дзе кветкі, там і мёд* заключаецца ў тым, што калі рабіць добрае, прыгожае, то і жыць будзе добра. Другое выказванне *Дзіця да маці, як краска да сонца* раскрывае пачуцці ласкі, любові і павагі, усведамлення клопату і ўдзячнасці. Іншая па настроі трэцяя прыказка *Адна кветка вясны не робіць.* Яе сэнс у тым, што адзінкавая з'ява не дае падставы для сведчання пра ўсе астатнія.

У працэсе чытання і абмеркавання сэнсу прыказкі *Дзіця да маці, як краска да сонца* вучні звяртаюцца да тлумачальнага слоўніка ў канцы вучэбнага дапаможніка, знаходзяць слова *краска* і чытаюць яго значэнне. Для лепшага разумення мэтазгодна прадэманстраваць малюнак ці фотаздымак.

— З якім словам рускай мовы яго можна пераблытаць? Што яно абазначае?

Арфаграфічная работа з кожнай прыказкай адбываецца наступным чынам: вымаўляецца слова з пропускам літары, вызначаецца гук на месцы пропуску. Абмяркоўваецца, якую літару трэба выбраць і чаму. Вучні запісваюць прыказку па алгарытме спісвання з форзаца 2. Падкрэсліваюць літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў. Адну прыказку пажадана даць для самастойнага выканання задання і ўзаемаправеркі.

***Практыкаванне 47.***

Работа з тэкстам практыкавання накіравана на падрыхтоўку вучняў да пераказу і адбываецца наступным чынам:

— Прачытайце першы сказ тэксту. Пра каго ў ім будзе гаварыцца? Прачытайце апорныя словы (запісаны на дошцы: *зямля, кветкі, смага, заплакала, дождж, выратаванне*) і скажыце, што магло адбыцца? Прачытайце тэкст і скажыце, ці правільная была ў нас здагадка.

Пасля чытання тэксту па частках вучні адказваюць на пытанні па яго змесце, якія задаюць адзін аднаму франтальна. Навучэнцы атрымліваюць ад настаўніка карткі з лічбамі 1, 2 ці 3, адпаведна выбіраюць частку тэксту для пераказу і рыхтуюць яе. Далей настаўнік прапануе скласці групы для пераказу ўсяго тэксту: прайсці па класе і сабраць «цягнікі» з вучняў, якія пераказвалі першую, другую і трэцюю часткі. Навучэнцы пераказваюць тэкст у групах. Потым займаюць свае месцы.

Апошняе, пісьмовае, заданне практыкавання вучні выконваюць самастойна. Пасля выканання задання праверка ажыццяўляецца франтальна праз каменціраванне.

— Назавіце літары, якія абазначаюць галосныя гукі і мяккасць зычных гукаў.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 35, практ. 48. Неабходна звярнуць увагу вучняў, што запіс павінен быць зроблены ў слупок, паколькі гэта вершаваная форма.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Настаўнік просіць назваць галосныя гукі і літары, якія іх абазначаюць. Прапануе прачытаць праблемнае пытанне на с. 33 і адказаць на яго. Вучні адзначаюць заданні, якія ў іх атрымаліся.

## Урок 11. Абазначэнне літарамі *е, ё, ю, я, і* гукаў [й'э], [й'о], [й'у], [й'а], [й'і]

***Мэты ўрока:*** актуалізаваць веды пра двайную ролю літар ***е, ё, ю, я, і***; фарміраваць уменне вызначаць у словах літары, якія абазначаюць два гукі, і правільна перадаваць іх на пісьме; развіваць фанематычны слых; узбагачаць слоўнікавы запіс назвамі раслін, жывёл; фарміраваць уменне падбіраць агульнае слова да групы прадметаў, уменне пісаць пад дыктоўку сказы; выхоўваць цікавасць да вывучэння прыроды роднага краю.

***Абсталяванне:*** літары разразной азбукі, наборнае палатно, фішкі для гука-літарнага аналізу, прадметныя малюнкі, на якіх адлюстраваны баян, ёрш, вераб'і, кальё.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Перш чым праверыць выкананне дамашняга задання, настаўнік прапануе аднавіць «зламаную» схему (зроблена з літар разразной азбукі на наборным палатне): пераставіць карткі на свае месцы.

| [э] | | | | [о] | | | | [у] | | | | [а] | | | | [і] | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | е | | э | | ё | | о | | у | | ю | | а | | | | і | | я |

Вучні знаходзяць неадпаведнасці, перастаўляюць карткі і даюць тлумачэнні.

Потым пад кіраўніцтвам настаўніка «чытаюць» схему: «Гук [э] абазначаецца літарай ***э*** пасля цвёрдых зычных. Гук [э] абазначаецца літарай ***е*** пасля мяккіх зычных». Аналагічна арганізуецца праца па схеме далей. Настаўнік абагульняе і нагадвае тэму мінулых заняткаў.

***Практыкаванне 48.***

Выразнае чытанне верша вучнямі. Вызначэнне слоў, якія падказваюць адгадку; слоў, якія адказваюць на пытанні *які?, якая?, якое?*.

Праверка выканання задання робіцца ланцужком. Кожны вучань называе адно слова, вызначае літару, якая абазначае галосны гук (называе які) і мяккасць зычнага гука. Калі ў слове такой літары няма, то вучань паведамляе пра гэта.

Настаўнік задае абагульняльнае пытанне: «Якія літары абазначаюць галосныя гукі і мяккасць зычных гукаў?»

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

Настаўнік паведамляе, што на ўроку вучні даведаюцца яшчэ пра адну таямніцу гэтых літар і заклікае ўважліва паслухаць гісторыю пра Чамучыка.

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Пасля чытання праблемнай сітуацыі настаўнік просіць вучняў дапоўніць тэкст. Калі вучні гэтага зрабіць не могуць, то настаўнік запрашае іх выразна агучыць словы Чамучыка. Робіцца гука-літарны аналіз слова *елка*. Вызначаюцца і характарызуюцца гукі ў пачатку слова: «Якой літарай абазначаны гукі [й'э]?»

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— Якую таямніцу літар ***е, ё, ю, я, і*** будзем даследаваць? Прачытайце праблемнае пытанне. Якія версіі адказаў у вас ёсць?

Усе выказаныя вучнямі меркаванні настаўнік запісвае на дошку. Запрашае выканаць практыкаванні і дакладна вызначыць, калі літары ***е, ё, ю, я, і*** абазначаюць два гукі.

***Практыкаванне 49.***

Выкананне практыкавання лепш арганізаваць на дошцы:

1. Настаўнік вывешвае на дошку малюнак баяна.
2. Вучні вымаўляюць слова і робяць яго гукавы аналіз. На дошцы з'яўляецца гукавая схема слова.
3. Гукі на схеме закрываюцца літарамі, якія іх абазначаюць.
4. Слова запісваецца ў сшытак.

Аналагічная праца праводзіцца са словамі *ёрш, вераб'і, кальё*.

Вучні па запытанні настаўніка падкрэсліваюць у кожным слове літары, якія абазначаюць два гукі. Адказы вучняў параўноўваюцца з выказанымі раней версіямі. На дошцы застаюцца запісы:

у пачатку слова;
пасля галосных;
пасля *ь*;
пасля ' (апострафа).

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік прапануе вучням разгарнуць падручнік на с. 37, прачытаць правіла і сказаць, ці правільна мы правялі даследаванне. Навучэнцы чытаюць правіла і дадаюць прыклады з выкананага практыкавання.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 50.***

Вучні разглядваюць малюнкі да практыкавання, называюць выявы. Настаўнік прапануе прачытаць

Часопіс у часопісе
№ 167
КАНСУЛЬТАНТ намесніка дырэктара

***Ларисова Е. В.**, заместитель директора по учебной работе гимназии № 32 г. Минска*

# Справка по результатам контроля создания условий для успешной адаптации учащихся I классов

**Вид контроля:** комплексный.

**Срок контроля:** __.__.20__ — __.__.20__.

**Цель контроля:** изучение деятельности учителей I классов в рамках организации образовательного процесса для успешной адаптации учащихся; получение объективной информации о прохождении адаптационного периода первоклассниками с целью предупреждения и преодоления трудностей в обучении, профилактики возможных негативных тенденций личностного и интеллектуального развития обучающихся.

**Изучены вопросы:** адаптация учащихся I классов.

**Контроль осуществлялся** заместителем директора по учебной работе ... (*фамилия, инициалы*), педагогом-психологом ... (*фамилия, инициалы*) в соответствии с планом работы государственного учреждения образования «_________» на 20__/20__ учебный год в рамках внутреннего контроля за обеспечением качества образования.

**В ходе контроля установлено следующее.**

**Образовательный процесс в I классах.** В декабре 20__/20__ учебного года в параллели I классов обучается __ учащихся:

| Класс | Классный руководитель | Воспитатель ГПД | Количество учащихся |
|---|---|---|---|
| I «А» | ... (*фамилия, инициалы*) | ... (*фамилия, инициалы*) | 28 |
| ... | | | |

Во 2-й четверти 20__/20__ учебного года выбыли: из I «__» класса в ГУО «Средняя школа № __ г. Минска» ... (*фамилия, имя*) (приказ от __.__.20__ № __); <...>

Прибыли: в I «__» класс из государственного учреждения образования «Гимназия № __ г. Минска» ... (*фамилия, имя*) (приказ от __.__.20__ № __).

Профессиональная подготовленность и компетентность всех педагогов соответствует требованиям, предъявляемым к учителю и воспитателю на современном этапе.

Образовательный процесс в I классах осуществляется в рамках пятидневной учебной недели и шестого школьного дня, в условиях обеспечения обучающимся сохранения здоровья, поддержания их работоспособности и необходимой двигательной активности, в соответствии с режимом дня для детей шестилетнего возраста, который рассмотрен педагогическим советом учреждения образования, обсуждён с родительским комитетом, утверждён директором гимназии.

Еженедельная учебная нагрузка учащихся, согласно учебному плану, — 18 ч. Расписание учебных занятий во всех I классах составлено с учётом динамики работоспособности младших школьников в течение дня и учебной недели, утверждено директором гимназии.

Начало занятий — в 8 ч 30 мин. Перед первым уроком проводится утренняя гимнастика. В среду — информационный час. Продолжительность учебных занятий — 35 минут. Между учебными занятиями — 20-минутные перемены. После второго урока организована динамическая перемена. В течение каждого учебного занятия проводятся две физкультминутки — двигательная и зрительная. Комплексы упражнений периодически меняются.

Первоклассники обеспечены необходимыми учебниками и учебными пособиями. Домашние задания в первом классе не задаются.

В учебных кабинетах оформлены классные уголки, в которых представлена информация о режиме работы ГПД, расписание учебных и факультативных занятий, сведения о руководстве гимназии, практические рекомендации по адаптации первоклассников. В каждом классе есть государственная символика Республики Беларусь и города Минска.

У працэсе працы з тэкстам вучні вызначаюць па тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка значэнне слова *стае*.

— Прачытайце верш самастойна і выканайце заданне перад вершам.

Далей вучні робяць гука-літарны аналіз выдзеленых у вершы слоў, параўноўваюць колькасць гукаў і літар, тлумачаць неадпаведнасць.

Вучні чытаюць уголас другую частку верша. Самастойна выконваюць апошняе заданне практыкавання. Робяць узаемаправерку.

***Практыкаванне 57.***

У працэсе працы з тэкстам практыкавання неабходна пазнаёміць вучняў з традыцыйным народным святам Дажынкі. З дапамогай інфармацыі тэксту вучні павінны атрымаць звесткі пра традыцыі гэтага свята, з чым яны былі звязаны. Асаблівую ўвагу трэба надаць асэнсаванню пазатэкставай інфармацыі пра цяжкую працу хлебаробаў, простую ежу, традыцыі нацыянальнай абрадавай культуры. Трэба пазнаёміць вучняў з дапамогай тлумачальнага слоўніка са значэннем слова *талака*.

Пасля самастойнага чытання тэксту вучні выконваюць заданні перад тэкстам. Заданне пасля тэксту вучні робяць самастойна. Па меркаванні настаўніка можна выкарыстаць праверку гэтага задання з дыягнастычнай функцыяй.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 41, практ. 58. Настаўнік папярэджвае, што трэба спісаць увесь верш. Заданні па падкрэсліванні зрабіць непасрэдна ў спісаным тэксце.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Пра якія традыцыі беларусаў вы даведаліся на ўроку? У чым прыгажосць беларускага канца лета і пачатку восені? Якія адметнасці ёсць у літар ***е, ё, ю, я, і***?

## Урок 13. Падзел слова на склады

***Мэты ўрока:*** замацаваць веды пра асаблівасці падзелу слова на склады, складаўтваральную ролю галосных у словах; фарміраваць уменне дзяліць словы на склады, вызначаць колькасць складоў у словах; развіваць уменні параўноўваць, ажыццяўляць групоўку, пераказваць тэкст з апорай на малюнак; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** гукавыя схемы слоў *аўтобус, абруч, вясёлка, сасна, чайка* з падзелам на склады; фотаздымкі ці малюнкі, на якіх адлюстраваны баравікі, падасінавікі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Пры праверцы дамашняга задання неабходна паўтарыць літары, якія абазначаюць галосныя гукі, узнавіць літары, якія абазначаюць галосны гук і мяккасць зычнага гука, выпадкі, калі яны абазначаюць два гукі. З гэтай мэтай праверка дамашняга задання арганізуецца франтальна: вучні называюць словы і літары, якія абазначаюць галосныя гукі ў іх, вымаўляюць гук, які абазначаны гэтай літарай. Далей навучэнцы называюць слова, у якім літара абазначае два гукі: галосны і гук [й'], тлумачаць пазіцыю літары ў слове.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік запрашае вучняў паглядзець невялікую сцэнку і сказаць, калі хлопчык вымавіў словы па складах. Падрыхтаваныя вучні разыгрываюць праблемную сітуацыю са с. 42 вучэбнага дапаможніка. Вучні адказваюць, якія словы Чамучык вымавіў па складах. Настаўнік разыгрывае сітуацыю непаразумення і просіць патлумачыць, калі ён сказаў словы па складах.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Увага вучняў звяртаецца на праблемнае пытанне (с. 42). Вучні фармулююць тэму ўрока і задачу, якую трэба вырашыць: навучыцца даведвацца, колькі ў слове складоў.

***Практыкаванне 59.***

Спачатку вучні вусна вызначаюць словы, запісаныя на прыступках лесвіцы. Далей ім трэба выбраць падставу для падзелу слоў на дзве групы. Пасля гэтага ў колькасці складоў у словах і доказу яго справядлівасці (там ёсць толькі двух- і трохскладовыя словы), вучні на дошцы і ў сшытках запісваюць словы па складах па парадку «прачытання» лесвіцы ў два слупкі. Падкрэсліваюць у словах літары, якія абазначаюць галосныя гукі. На дошцы кожны слупок неабходна пазначыць адпаведнай схемай:



Настаўнік прапануе ўважліва паглядзець на словы кожнага слупка і сказаць, колькі літар галосных гукаў у словах першага слупка, колькі ў іх складоў. Аналагічна са словамі другога слупка.

— Які вывад можна зрабіць? Колькі ў слове літар галосных гукаў, столькі і складоў.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні чытаюць правіла самастойна і вызначаюць, пра што яны яшчэ з яго даведаліся. Колькі складоў можа быць у слове?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 60.***

Работа з матэрыялам практыкавання арганізуецца франтальна. Вучні называюць слова, адшукваюць яго схему на дошцы. Каб даказаць адпаведнасць выбранай схемы слову, робіцца яго гука-літарны разбор, вызначаецца колькасць галосных гукаў і складоў. Потым слова запісваецца па складах, літары галосных гукаў падкрэсліваюцца. Пакажам паслядоўнасць работы на прыкладзе слова *аўтобус*:

1. Вымавіце слова, выдзяляючы голасам першы гук. Які першы гук у слове? Ён зычны ці галосны? Вымавіце слова, выдзяляючы голасам другі гук. Які другі гук? Ён зычны ці галосны? Цвёрды ці мяккі?

Далей характарызуюцца астатнія гукі.

2. Знайдзіце гукавую схему гэтага слова. Колькі ў ім галосных гукаў? Складоў?

3. Вымавіце слова па складах у адпаведнасці са схемай.

4. Вымавіце і запішыце першы склад, другі склад. І г. д.

5. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Колькі іх? А колькі складоў?

Аналагічная праца праводзіцца з астатнімі словамі. Пасля выканання практыкавання настаўнік прапануе вучням адказаць на праблемнае пытанне, а прыклады прывесці са слоў практыкавання.

***Работа з матэрыялам рубрыкі «Увага».***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на слова *сасна*: «Як можна падзяліць яго на склады? Як гэта зрабіць правільна? Знайдзіце адказ у рубрыцы "Увага" (с. 43). Як правільна падзяліць слова *сасна* на склады?»

— Пра што яшчэ даведаліся з рубрыкі?

Настаўнік разыгрывае сітуацыю здзіўлення і прапануе вучням вылучыць у слове *сасна* склад з адной літары: *са-с-на*. Запытваецца, ці пагаджаюцца з ім вучні. Вучні даказваюць, што так вылучыць склад з адной літары нельга, таму што гэта літара павінна абазначаць галосны гук.

***Практыкаванне 61.***

Вучні складваюць прыказку са складоў самастойна. Агучваюць яе. Тлумачаць сэнс з дапамогай настаўніка: «Якое слова складаецца з аднаго склада? Чаму? Колькі ў ім гукаў? Галосных гукаў? Літар?» Вучні тлумачаць неадпаведнасць.

Навучэнцы запісваюць прыказку з каменціраваннем пасля франтальнай падрыхтоўкі ў адпаведнасці з алгарытмам на форзацы 2. Падкрэсліваюць літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Зверху над кожным словам указваюць колькасць складоў.

***Практыкаванне 62.***

Вучні разглядваюць малюнак і адказваюць на пытанні: «Чым занятыя вавёркі? Навошта яны гэта робяць? Як называецца тэкст?» Настаўнік прапануе прачытаць тэкст і сказаць, хто і куды спазніўся. Вучні пасля чытання выказваюць свае меркаванні. Калі яны не адпавядаюць зместу тэксту, чым дэманструюць яго неразуменне вучнямі, то тэкст перачытваецца ўголас ланцужком. Вучні тлумачаць назву тэксту.

Пісьмовае заданне практыкавання выконваецца наступным чынам: выдзеленае слова прачытваецца, у ім вызначаюцца літары галосных гукаў. Слова падзяляецца на склады, запісваецца з каменціраваннем: «Пішу першы склад *да-*, літара галоснага гука [а], пішу другі склад *-жджу*, літара галоснага гука [у]. У слове *дажджу* два галосныя гукі і два склады». Аналагічна тлумачацца іншыя словы.

— Якое правіла мы пацвердзілі пры выкананні гэтага задання?

Работа над вусным пераказам часткі тэксту пачынаецца з вызначэння патрэбнай часткі. Настаўнік прапануе ўважліва разгледзець малюнак і знайсці адпаведную яму частку тэксту. Пасля таго як гэта частка тэксту будзе вызначана і прачытана вучнямі, назваць, якая дэталь на малюнку не адпавядае зместу тэксту. Калі вучні не змогуць вызначыць, што на малюнку паказаны падасінавікі, а не баравікі, то трэба паказаць асобныя фотаздымкі ці малюнкі гэтых грыбоў. Настаўнік прапануе яшчэ раз уважліва паглядзець на малюнак у дапаможніку і сказаць, якія грыбы там намаляваны. *(Гэта падасінавікі.)* Пра якія грыбы гаворыцца ў тэксце? *(У тэксце гаворыцца, што вавёркі нанізвалі баравікі.)* Настаўнік тлумачыць заданне і запытваецца, што трэба змяніць у тэксце, каб была адпаведнасць малюнку. Вучні перачытваюць частку тэксту, замяняючы ў ім слова *баравікі* на *падасінавікі*. Далей настаўнік арганізуе работу спачатку па пытаннях да вучняў, потым навучэнцы пераказваюць змененую частку тэксту: спачатку індывідуальна выкліканыя 2–3 вучні, потым — у парах. Настаўнік падводзіць вынік пераказу, адзначае ўдалыя адказы, каменціруе недакладнасці.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 45, практ. 63. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што спісваць трэба толькі першы сказ. Колькасць складоў ставіцца над словамі лічбай так, як у класнай рабоце.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якую заканамернасць вызначылі і прасачылі на ўроку? Колькі складоў можа быць у слове? Колькі літар можа быць у складзе?

## Урок 14. Падзел слова на склады

***Мэты ўрока:*** удасканальваць уменне дзяліць словы на склады, вызначаць колькасць складоў у словах; развіваць уменні параўноўваць, устанаўліваць заканамернасць, складаць працяг тэксту з апорай на малюнак; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць ветлівыя адносіны адзін да аднаго, беражлівыя адносіны да прыроды.

***Абсталяванне:*** малюнкі ці фотаздымкі, на якіх адлюстраваны вавёрка, паўлін, ліса.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Настаўнік прапануе разгледзець малюнкі ці фотаздымкі з выявамі вавёркі, паўліна, лісы і вызначыць, на якім малюнку адлюстраваны звярок, пра якога гаворыцца ў вершы-загадцы.

— Чаму не падыходзяць іншыя малюнкі?

Вучні падпісваюць усе малюнкі, вызначаюць колькасць галосных гукаў у іх і зверху над словамі пазначаюць колькасць складоў. Потым правяраюць колькасць складоў з дапамогай прыёмаў пляснуць у далоні, рука пад падбародак.

— Назавіце літары галосных гукаў, якія абазначаюць галосны гук і мяккасць зычнага гука. Назавіце гэты галосны гук. Назавіце ў запісаным дома сказе словы з аднаго склада, з двух складоў. Давайце прыгадаем, што мы даведаліся пра склады на мінулым уроку па апорных схемах:

1. Колькасць (знак склада) у слове = колькасць (знак галоснага гука).

2. Адзін (знак склада) = адна літара, калі яна абазначае (знак галоснага гука).

3. Звычайна (знак склада) заканчваецца на (знак галоснага гука).

**3. Этап замацавання і абагульнення вывучанага матэрыялу.**

***Практыкаванне 64.***

Вучні чытаюць верш самастойна і называюць грыбы, назвы якіх сустрэліся ў вершы. Настаўнік дэманструе выявы гэтых грыбоў і прапануе вызначыць, дзе маслякі, а дзе баравікі. Вучні адказваюць, вусна вызначаюць колькасць складоў у гэтых словах з дапамогай прыёмаў, названых вышэй. Вызначаюць у іх галосныя гукі і правяраюць па іх колькасць складоў.

Заданне па развіцці маўлення вучняў выконваецца ў выглядзе нефармальнай гутаркі. Вучні дзеляцца сваімі

ўспамінамі дзе, калі і з кім яны збіралі грыбы. Расказваюць, што асабліва запомнілася, якія грыбы знайшлі, якое ўражанне ў іх выклікаў лес. Трэба засяродзіць увагу на тым, якія эмоцыі перажывалі вучні, дапамагчы ім гэтыя эмоцыі выказаць, перадаць словамі. У канцы гутаркі вусна фармулююцца правілы збору грыбоў.

Пасля вызначэння таго, хто мог размаўляць у вершы, настаўнік прапануе прачытаць верш па ролях у парах. Словы аўтара трэба прапусціць. Праверка выканання задання адбываецца франтальна.

— Прачытайце адказы Алеся. Вымавіце кожнае слова адказу па складах. Запішыце іх, падзяляючы словы на склады.

Адначасова заданне выконваецца вучнямі на дошцы з адваротнага боку. Праверка запісу адказаў Алеся праводзіцца ў парах. Вучні мяняюцца сшыткамі і вызначаюць правільнасць выканання задання, звяраюць з выкананнем задання на дошцы. Настаўнік скіроўвае ўвагу вучняў на схемы, якія разглядалі ў пачатку ўрока.

— Якімі ведамі мы скарысталіся пры выкананні гэтага задання?

***Практыкаванне 65.***

Пры выкананні гэтага практыкавання неабходна кіравацца наступнымі ўказаннямі, не звяртаючы ўвагі на заданне ў дапаможніку, якое ўтрымлівае недакладнасць. Настаўнік прапануе вучням прачытаць словы першага слупка і растлумачыць адрозненні ў значэннях слоў. Навучэнцы вызначаюць колькасць складоў у кожным слове першага слупка living рознымі спосабамі: пляснуць у далоні, рука пад падбародак, па колькасці галосных гукаў.

Далей вучні чытаюць словы другога слупка самастойна і выказваюць прапановы, якім словам трэба дапоўніць слупкі (*садоўнік*), даказваюць свае меркаванне. Далей працуюць аналагічна рабоце са словамі першага слупкоў.

Заданне выконваецца далей па гэтай жа схеме са словамі трэцяга (*грыб, грыбок, грыбнік*) і чацвёртага (*сыр, сырок, сыравар*) слупка.

Вучні з каменціраваннем запісваюць словы, якія дадалі ў другі і трэці слупок. Словы чацвёртага слупка запісваюць самастойна. Пасля выканання задання робяць узаемаправерку.

***Практыкаванне 66.***

Першае заданне практыкавання выконваецца ўсімі вучнямі вусна. Пасля таго як вучні назавуць колькасць складоў у кожным слове першага радка і вымавяць іх па складах, настаўнік прапануе вучням вусна самастойна ўтварыць словы другога радка з дапамогай аднаго са складоў слова першага радка. Хто з вучняў выканаў заданне, устае. Ён можа дапамагчы іншым вучням па іх запытанні. Выкліканыя вучні называюць слова, якое атрымалася, і выкарыстаны склад са слова верхняга радка. Потым запісваюць словы па складах на дошцы і ў сшытках. Узор адказу вучня: «Са слова *бульба* я ўзяў склад *буль*, атрымалася слова *ба-буль-ка*. У ім тры склады. Запісваю першы склад *ба*, другі склад *буль*, трэці склад *ка*. Падкрэсліваю літары галосных гукаў: ***а, у, а***». Аналагічна адбываецца работа з астатнімі словамі.

Заданне па развіцці маўлення вучняў накіравана на пашырэнне лексічнага запасу і прапедэўтыку вызначэння слоў розных лексіка-граматычных груп. Калі вучні самастойна не могуць падабраць словы, што адказваюць на пытанне *я к а я?*, то можна прапанаваць набор слоў (запісаць на дошцы). З іх трэба вызначыць словы, якія падыходзяць да запісаных слоў па сэнсе. Напрыклад: ласкавая, вясёлая, працоўная, глыбокая, касмічная, вялікая, дружная, актыўная, бурная. Пры адказе вучні абавязкова ставяць пытанне ад зададзенага слова да падабранага: «Бабуля (*я к а я?*) вясёлая».

***Практыкаванне 67.***

Перш чым выконваць заданні практыкавання, неабходна даць магчымасць вучням самастойна прачытаць пачатак тэксту, уважліва разгледзець малюнкі і зразумець логіку падзей. Пасля гэтага вучні вызначаюць, чаму тэкст называецца «Ветлівасць», хто праявіў ветлівыя паводзіны. Пасля гэтага вучні рыхтуюцца расказаць тэкст па малюнках. Гэта работа можа быць арганізавана рознымі спосабамі ў залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці класа.

Варыянт 1. Навучэнцы паслядоўна расказваюць, дапаўняюць адзін аднаго па малюнках у падручніку пасля таго, як настаўнік ці падрыхтаваны вучань прачытаюць пачатак тэксту.

Варыянт 2. Навучэнцы ў групах па пяць чалавек размяркоўваюць чытанне пачатку тэксту і малюнкі для расказа. Паслядоўна чытаюць і расказваюць па малюнках.

Варыянт 3. Работа арганізуецца аналагічна варыянту 2, толькі вучням на дошцы даюцца апорныя словы да кожнага малюнка.

Да малюнка 1: кошык напаўняўся, зняў кепку.

Да малюнка 2: не шанцавала, хлопчык запытаўся, парада дзядзькі, зняць шапку.

Да малюнка 3: зняў шапку, заўважыў баравік, з радасцю зрэзаў.

Да малюнка 4: Міколка запытаўся, дзядзька адказаў, быць пільным і ўдзячным.

Прыкладны варыянт тэксту, які можа атрымацца:

*Ветлівасць*

*Восеньскім поўднем выбраўся Міколка з дзядзькам у грыбы. Прывабіў іх бярозавы гаёк, што знаходзіўся кіламетры за два ад чыгункі.*

*У лесе Міколка заўважыў, што дзядзька раз за разам нахіляецца, каб зрэзаць грыб. Яго кошык напаўняўся грыбамі. Дзядзька аж кепку зняў.*

*А Міколку ніяк не шанцавала.*

*— Чаму так? — запытаўся хлопчык у дзядзькі. Ён параіў хлопчыку таксама зняць шапку.*

*Зняў Міколка з галавы шапку і раптам заўважыў крамяны баравік. Хлопчык з радасцю прысеў і зрэзаў прыгожы грыб.*

*Міколка падышоў і запытаўся ў дзядзькі: «Чаму грыбы трапляюцца, калі шапку знімеш?» Дзядзька хітравата ўсміхнуўся і адказаў: «Хто ветлівасці не любіць?» Міколка зразумеў, што грыбніку важна быць пільным і ўдзячным.*

Пасля ўзнаўлення тэксту выконваецца апошняе пісьмовае заданне кожным вучнем самастойна. Яно мае дыягнастычны характар. Пасля праверкі сшыткаў вучняў настаўнік робіць вывад пра ўзровень сфарміраванасці ўмення вызначаць колькасць складоў у слове і дзяліць словы на склады.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 48, практ. 68. Настаўнік запытваецца, што значыць «алфавітны парадак», папярэджвае, што словы трэба запісаць не проста па складах, а ў алфавітным парадку, нагадвае, што можна выкарыстаць алфавіт, змешчаны на форзацы.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія ўменні вы набылі на ўроку? Якія віды работы гэтаму паспрыялі?

## Урок 15. Падзел слова для пераносу

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць з правілам падзелу слоў для пераносу; фарміраваць уменне правільна пераносіць словы з аднаго радка на другі; замацоўваць уменне дзяліць словы на склады; развіваць уменне ажыццяўляць групоўку; пазнаёміць са слоўнікавым словам *дождж*; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі кветак; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць беражлівыя адносіны да раслін, эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** буйнафарматная паштоўка, літары для слова *дождж*.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Выкліканы вучань чытае верш і дапаўняе яго патрэбным словам. Вучні называюць словы ў алфавітным парадку. Тлумачаць, чаму спачатку трэба запісаць слова *маслякі*, а потым *махавікі*.

Падзел слоў на склады правяраецца франтальна. Вучні хорам чытаюць словы і пляскаюць у далоні пасля кожнага склада. Называюць колькасць галосных літар і колькасць складоў у слове.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік гаворыць дзецям, што сустрэў раніцай засмучанага Чамучыка. Ён просіць дапамогі. Учора Чамучык падпісваў бабулі прыгожую паштоўку і ледзь яе не сапсаваў. Настаўнік дэманструе вучням надпіс на паштоўцы ці накіроўвае ўвагу вучняў на с. 49 падручніка. Вучні чытаюць надпіс, зроблены на паштоўцы, гавораць свае меркаванні, як дапамагчы Чамучыку. Яны карыстаюцца пры гэтым ведамі, атрыманымі ў першым класе. Фармулююць праблему, з якой сутыкнуўся Чамучык.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Вучні чытаюць праблемнае пытанне. Выказваюць свае меркаванні для адказу на яго.

***Практыкаванне 69.***

Настаўнік прапануе сабраць для бабулі Чамучыка букет кветак. Ён чытае назвы кветак і прапануе вучням знайсці і разгледзець малюнкі кветак, якія так называюцца. Задае пытанне: «Як пазнаць гэтыя кветкі?» ці «Чаму іх так назвалі?» Важна, каб пры адказе на пытанні вучні маглі апісаць кветку, назваць яе характэрныя прыметы.

Настаўнік выразна чытае верш, задае пытанне па змесце, сфармуляванае ў падручніку. Вучні самастойна чытаюць верш і заданне пасля яго. Выкананне задання арганізуецца ў сшытках і на дошцы. У працэсе выканання задання вучні, якія робяць яго каля дошкі, каменціруюць выкананне па ўзоры, пададзеным на папярэдніх уроках.

— Як, па вашым меркаванні, можна перанесці запісаныя словы з аднаго радка на другі?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць правіла на с. 50 і адказваюць, ці правільнае было іх меркаванне. Потым вучань чытае правіла ўголас, астатнія адказваюць на пытанне, якія асаблівасці пераносу слоў са збегам зычных. Прыводзяць прыклады з папярэдняга практыкавання слоў — назваў кветак, якія можна падзяліць для пераносу варыятыўна. Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка засвойваюць, што, каб перанесці слова з аднаго радка на другі, трэба падзяліць яго на склады. Пакінуць на радку склады, якія змяшчаюцца, а астатнія перанесці на наступны радок.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 70.***

Пасля прачытання і адгадвання загадкі адбываецца работа па засваенні правапісу слоўнікавага слова *дождж* на аснове малюнка да практыкавання. Варта запытацца: «Колькі складоў у гэтым слове? Ці можна яго перанесці з аднаго радка не другі?» На наборным палатне з літар складаецца слова *дождж*.

Вучні чытаюць загадку і знаходзяць словы, якія складаюцца з аднаго склада. Абмяркоўваюць магчымасць іх пераносу. На дошцы робіцца схематычны запіс:

Нельга *(знак пераносу) (знак аднаго склада)*.

Вучні яшчэ раз чытаюць загадку і называюць словы, якія маюць склад з адной літары. Выказваюць свае меркаванні, як перанесці такія словы. Настаўнік правакуе вучняў прапановай, што такія словы нельга падзяліць для пераносу. На дошцы робіцца схематычны запіс:

Нельга *(знак пераносу)*
*(схема слова са складам з адной літары)*.

Вучні называюць выдзеленыя словы. Выказваюць свае меркаванні, як іх можна перанесці.

***Работа з матэрыялам рубрыкі «Увага».***

Настаўнік скіроўвае ўвагу вучняў на матэрыял рубрыкі. Навучэнцы знаёмяцца з ім. Зачытваюць фрагменты інфармацыі, якая дапаможа падзяліць для пераносу кожнае выдзеленае слова папярэдняга практыкавання. Такім чынам вучні знаёмяцца з матэрыялам рубрыкі і адначасова замацоўваюць яе. Пажадана зрабіць дэманстрацыйны матэрыял і вывесіць яго ў класе для выкарыстання на іншых пісьмовых занятках.

***Практыкаванне 71.***

На матэрыяле практыкавання замацоўваецца ўменне правільна дзяліць словы для пераносу. Спосаб арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў залежыць ад ступені засваення вывучаемага матэрыялу. Магчыма пасля падзелу вучняў на групы «пілотаў» і «касманаўтаў» арганізаваць кіраўніцтва настаўнікам работай адной з гэтых груп. Напрыклад, «пілоты» выконваюць заданне самастойна, а з групай «касманаўты» працуе настаўнік па заданнях вучэбнага дапаможніка з каменціраваннем. Можна выканаць заданні кожнай групы ўсімі вучнямі класа паслядоўна з падрабязным тлумачэннем. Важна арганізаваць работу такім чынам, каб заданне было выканана правільна і асэнсавана.

***Практыкаванне 72.***

На матэрыяле практыкавання вучні паўтараюць правапіс слоўнікавага слова і блізкіх яму па сэнсе. Пры выкананні пісьмовага задання вучні звяртаюць увагу на словы, якія нельга падзяліць для пераносу. Важна паказаць вучням, што правільны падзел слова для пераносу можа ажыццяўляцца рознымі спосабамі, але запісваецца са знакам пераносу толькі адзін з іх.

***Практыкаванне 73.***

Практыкаванне выконваецца ў адпаведнасці з пададзенымі ў вучэбным дапаможніку заданнямі. Арганізаваць запіс сказаў трэба па алгарытме спісвання на форзацы 2. Пры неабходнасці можна выкарыстаць каменціраванне вучнямі запісу сказаў. У словах, якія нельга падзяліць для пераносу, вучні павінны вызначыць колькасць складоў, у двухскладовым слове паказаць межы складоў, падкрэсліць літары галосных гукаў. У рубрыцы «Увага» знайсці і прачытаць адпаведную інфармацыю.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 53, практ. 74. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў, што падзел слова для пераносу можна зрабіць рознымі спосабамі, але запісваецца са знакам пераносу толькі адзін з іх.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Як можна перанесці словы з аднаго радка на другі? Што трэба памятаць пры пераносе слоў з ***ў***, ' (апострафам), ***ь, дж, дз***? Як паказваем пры запісе падзел слоў на склады? Для пераносу?

## Урок 16. Падзел слова для пераносу

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць уменне правільна пераносіць словы з аднаго радка на другі, дзяліць словы на склады, вызначаць колькасць складоў у словах; развіваць уменні ажыццяўляць групоўку, фармуляваць пытанні да сказа; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць добразычлівыя адносіны адзін да аднаго.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі *У каго? Хто? Што?*.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Выкліканыя вучні запісваюць на дошцы зробленыя імі ў дамашнім заданні варыянты пераносу слоў, тлумачаць, якімі правіламі кіраваліся.

Франтальна трэба паўтарыць правілы падзелу слоў для пераносу, напрыклад, дапоўніць выказванні:

1. Падзяліць слова на склады. Перанесці па складах.
2. Калі ў складзе побач некалькі зычных, то...
3. Калі слова складаецца з аднаго склада, то...
4. Калі ў слове ёсць склад з адной літары, то...
5. Калі ў слове ёсць ***й, ў, ь***, апостраф ('), то...
6. Калі ў слове ёсць ***дз, дж***, то...

Каб пазбегнуць блытання вучняў паміж падзелам слова на склады з падзелам слова для пераносу, можна дамовіцца, што падзел слова на склады выконваецца вертыкальнымі рыскамі на межах складоў у слове. Падзел для пераносу абазначаецца адасобленым напісаннем складоў праз злучок у месцах магчымага пераносу слова.

**3. Этап замацавання і абагульнення вывучанага матэрыялу.**

***Практыкаванне 75.***

Навучэнцы выконваюць заданне самастойна. Падчас праверкі вучні не толькі называюць варыянты правільнага падзелу слоў для пераносу, але вызначаюць і тлумачаць памылковы падзел слоў для пераносу, паказаны на малюнках.

***Практыкаванне 76.***

Найперш выконваецца заданне лексіка-семантычнага характару. Словы першага радка падзяляюцца на групы свойскіх і дзікіх жывёл, словы другога радка — жывёлы беларускага лесу і афрыканскай саванны.

Наступным выконваецца заданне па адрозненні паміж падзелам слова на склады з падзелам слова для пераносу. Пры выкананні гэтага задання вучні абавязкова павінны аргументавана патлумачыць на прыкладзе кожнага слова, што яно падзелена на склады, а не для пераносу.

Заданне па запісе слоў з дзяленнем для пераносу можа суправаджацца каменціраваннем. Папярэдне вучні прапануюць свае варыянты падзелу слоў для пераносу. Пры дастатковай падрыхтаванасці вучняў класа апошняе заданне можна зрабіць самастойна з наступнай франтальнай праверкай.

***Практыкаванне 77.***

Заданне па дапаўненні слоў павінна выконвацца на падставе дастатковай аргументацыі прапанаваных слоў вучнямі. Далей адбываецца праца па пошуку слоў са складам з адной літары. Пажадана выпісаць гэтыя словы на дошку, падзяліць на склады, вызначыць літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Вучні могуць запісаць варыянты падзелу гэтых слоў для пераносу самастойна, а потым растлумачыць свой выбар. Над словамі трэба пазначыць колькасць складоў.

З мэтай паўтарэння пройдзенага трэба прапанаваць заданне адшукаць словы, у якіх адна літара абазначае галосны гук і гук [й']. Калі заданне выклікае цяжкасці ў вучняў, можна прапанаваць адгарнуць і прыгадаць правіла на с. 37.

***Практыкаванне 78.***

Вучні знаёмяцца з тэкстам практыкавання і «расшыфроўваюць» выдзеленыя словы. Потым чытаюць тэкст уголас і адзначаюць, як былі «зашыфраваны» словы. Заданне па пастаноўцы пытанняў да сказаў мэтазгодна арганізаваць як паступовае чытанне тэксту па адным сказе і зварот да вучняў: «Як пра гэта можна спытаць?» Пры неабходнасці можна прапанаваць апоры ў выглядзе пытальных слоў ці вызначыць у кожным сказе слова, пра якое трэба запытацца. Пасля таго як вучні зададуць пытанні да кожнага сказа, мэтазгодна пагутарыць з імі на тэму святкавання дня нараджэння, правілаў паводзін пры віншаванні і атрыманні падарунка, падзяліцца меркаваннямі, як зрабіць дзень нараджэння прыемным, каму трэба падзякаваць у дзень нараджэння.

Пісьмовае заданне да практыкавання вучні выконваюць самастойна.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 56, практ. 79. Настаўнік звяртае ўвагу, што спісваць верш не трэба.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Чым карыснае ўменне пераносіць словы? Як трэба гэта рабіць?

## Урок 17. Націск

***Мэты ўрока:*** замацаваць веды пра націск, асаблівасці яго вызначэння ў слове; фарміраваць уменне вызначаць націскны і ненаціскныя склады ў слове; адпрацоўваць уменне размяшчаць словы ў алфавітным парадку; развіваць уменні параўноўваць, рабіць вывад, ажыццяўляць групоўку, пераказваць тэкст з апорай на малюнак; пазнаёміць са слоўнікавым словам *свята*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** малюнкі, на якіх адлюстраваны мята, печкуры; картка са слоўнікавым словам *свята*; карткі ў выглядзе рыбак са словамі *вядро, вуда, чарвяк, сонейка, улоў, кручок, сябар, возера, раніца*.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 79.***

Вучні чытаюць верш, называюць, што падарылі хлопчыку на імяніны. *(Футбольны мяч, майку, пенал, зайку, боты.)* Настаўнік дадаткова цікавіцца:

— Якія назвы членаў сям'і сустрэліся ў вершы? *(Маці, тата, брат, сястрычка.)* Якім словам, блізкім па значэнні, можна замяніць слова *крама*? *(Магазін.)*

Праверка пісьмовага задання суправаджаецца пытаннямі:

— Як вы падзялілі словы для пераносу? *(Фут-больны (фу-тболь-ны) мяч, май-ку, пе-нал, зай-ку, бо-ты.)* Якое слова нельга падзяліць для пераносу? *(Мяч.)* Чаму? *(Гэта слова з аднаго склада.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць сітуацыю, якая адбылася з Чамучыкам.

— Колькі складоў у слове *Чамучык*? *(Ча-му-чык — 3 склады.)* Які склад у імені хлопчыка маці вымавіла мацней за іншыя? *(Склад* му*.)* Як называецца вылучэнне склада ў слове сілай голасу? *(Націск.)*

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе тэму ўрока і фармулюе асноўныя мэты: «Сёння мы з вамі ўспомнім, які склад у слове з'яўляецца націскным, а якія — ненаціскнымі; будзем вучыцца правільна вызначаць націск у словах».

— Прыгадайце з урокаў навучання грамаце, што трэба зрабіць, каб вызначыць націскны склад. *(Можна «паклікаць слова»; запытаць, перапытаць; запытаць са здзіўленнем; вымавіць ласкава ці з гонарам.)*

***Практыкаванне 80.***

Выкананне задання арганізуецца з каменціраваннем. Вучні разглядваюць першую пару малюнкаў, састаўляюць словы са складоў і запісваюць іх. Называюць літары, якія абазначаюць галосныя гукі. Падкрэсліваюць у словах склад, які вымаўляецца мацней за іншыя. Такім чынам арганізуецца праца з кожнай парай слоў. (Тра<u>ва</u>, <u>дрэ</u>ва, ма<u>лі</u>ны, лі<u>мо</u>ны, вя<u>рба</u>, бара<u>вік</u>, <u>сон</u>ца, пара<u>сон</u>.)

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 58).

— Што такое націск? Які склад называецца націскным? А якія склады — ненаціскнымі? Дзе ставіцца знак націску ў словах?

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням разгадаць рэбус. Для гэтага неабходна назваць расліну, якую бачаць на малюнку. *(Мята.)* У слове *мята* літару ***м*** трэба замяніць на ***в*** і назваць слова, якое атрымалася. *(Свята.)*




— Якія святы вы ведаеце? Пра якое свята расказвалася ў вершы з дамашняга практыкавання? *(Імяніны.)* Назавіце вашы любімыя святы.

— Вымавіце слова *свята*. (Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на правільнае вымаўленне слова — [с'в'ата]). Падзяліце слова на склады. *(*[с'в'а-та].*)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2).* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [с'в'а].*)* Назавіце гукі па парадку. *(*[с'] [в'] [а] [т] [а].*)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам:

| **св**ята |
|---|

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што пасля літары ***с*** мяккі знак пісаць не трэба.

Настаўнік прапануе вучням запісаць у сшытак слова *свята*, паставіць націск, падкрэсліць літары ***св***.

Настаўнік прапануе вучням прачытаць словы, запісаныя на дошцы (*святочны, святкаваць*) і растлумачыць, як яны разумеюць іх значэнне. *(Святочны — прыбраны, прыгожы, не будны. Святкаваць — урачыста адзначаць які-небудзь знамянальны дзень.)* Вучні запісваюць прапанаваныя словы, дзеляць іх на склады, вызначаюць націск.

Настаўнік запісвае на дошцы прыказку *Будзе і на нашай вуліцы свята*. Прапануе вучням прачытаць і адказаць, калі так гавораць. *(Кажуць у цяжкі час, выражаючы ўпэўненасць, што няўдачы мінуцца.)*

Вучні запісваюць прыказку (каменціраванае пісьмо). Вызначаюць націск у кожным слове прыказкі. *(Бу́дзе і на на́шай ву́ліцы свя́та.)*

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Калектыўнае выкананне задання «Рыбалка» на дошцы.***

На дошку прымацоўваюцца два вядзерцы (можна намаляваць), на якіх лічбамі 1, 2 пазначаны націскны склад. Вакол вядзерцаў размяшчаюцца словы *вядро, вуда, чарвяк, сонейка, улоў, кручок, сябар, возера, раніца*, запісаныя на картках у выглядзе рыбак. Выкліканы вучань «выцягвае рыбку» і перамяшчае яе ў адпаведнае вядзерца. Выкананне задання арганізуецца з каменціраваннем: вучань вымаўляе слова, голасам выдзяляючы націскны склад.

***Практыкаванне 81.***

Адзін вучань услых чытае верш Алеся Пісьмянкова. Настаўнік цікавіцца, што выклікала ў вучняў усмешку, чаму рыбалка для хлопчыка — гэта свята, каго называюць аматарам? Для ўдакладнення значэння слова *аматар* вучні звяртаюцца да тлумачальнага слоўніка ў вучэбным дапаможніку. *(Аматар — той, хто займаецца чым-небудзь не як прафесіянал; любіцель.)*

— Хто з вас любіць хадзіць на рыбалку? Што вы звычайна бераце на рыбалку? Ці ведаеце вы, як выглядаюць печкуры? (Настаўнік паказвае на малюнку печкуроў.) Якія іншыя назвы рыб вы ведаеце?

Пасля гутаркі вучні выконваюць пісьмовае заданне. Па парадку вымаўляюць словы з верша і вызначаюць націскны склад. Затым выдзеленыя словы запісваюць у два слупкі ў залежнасці ад месца націску.

| | |
|---|---|
| Максі́м | свя́та |
| рыба́к | та́та |
| ама́тар | |
| рыба́лка | |

— Знайдзіце ў вершы аднаскладовыя словы. *(Наш, для.)* Як вы думаеце, ці трэба ставіць націск у гэтых словах? Чаму?

***Абмеркаванне зместу рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 58).***

— Калі над словам не ставіцца знак націску? Прывядзіце прыклады аднаскладовых слоў, слоў з літарай **ё**.

***Практыкаванне 82.***

Вучні чытаюць тэкст, вызначаюць колькі ў ім частак і пра што даведаліся з кожнай часткі. *(У першай частцы расказваецца пра тое, дзе жывуць і як выглядаюць лятучыя рыбы. У другой частцы — пра палёт лятучай рыбы.)* Затым разглядваюць малюнак і тлумачаць, якой частцы ён адпавядае. Другую частку тэксту можна яшчэ раз перачытаць. Пасля чаго некалькі вучняў пераказваюць яе змест.

Настаўнік просіць вучняў знайсці ў тэксце словы, у якіх не трэба ставіць націск. *(Цёплых, рыб, хвост, палётам, праз, час, палёт.)* Чаму? *(Над словам з аднаго склада і над літарай **ё** знак націску не ставіцца.)*

Вучні самастойна спісваюць сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі, падкрэсліваюць націскны склад у гэтых словах. *(Лятучыя рыбы жывуць у цёплых морах. Лятучая рыба перад палётам падымаецца ў верхнія слаі вады. Палёт доўжыцца каля хвіліны.)*

***Практыкаванне 83.***

Выкананне вуснага задання можна арганізаваць у парах: адзін вучань чытае слова на рускай мове, а другі — на беларускай, потым наадварот.

— Чым адрозніваецца вымаўленне слоў у рускай і беларускай мовах? *(Словы адрозніваюцца націскам.)*

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што ў беларускай і рускай мовах ёсць словы, якія вельмі падобныя па напісанні і гучанні, але адрозніваюцца месцам націску.

Вучні па ланцужку называюць літары ў алфавітным парадку. Пры неабходнасці звяртаюцца да форзаца 1 вучэбнага дапаможніка.

Вучні яшчэ раз чытаюць словы, запісаныя пабеларуску. Запісваюць іх у алфавітным парадку, ставяць націск. *(Вярба́, дачка́, рэ́мень, рэ́шата, спі́на,* … арганізуецца на дошцы.

— Вусна да кожнага слова падбярыце па сэнсе слова, якое адказвае на пытанне *які?* (*якая?*, *якое?*). (Магчымы розныя адказы вучняў. Напрыклад: вярба (*якая?*) высокая, дачка (*якая?*) клапатлівая, рэмень (*які?*) скураны, рэшата (*якое?*) новае, спіна (*якая?*) роўная, шчаўе (*якое?*) кіслае.)

***Практыкаванне 84.***

Пасля прачытання верша вучні называюць слова, якое адрозніваецца месцам націску ў беларускай і рускай мовах. *(Крапіва́ — крапи́ва.)*

Пісьмовае заданне вучні выконваюць самастойна. Запісваюць выдзеленыя словы, рыскамі дзеляць іх на склады, падкрэсліваюць першы пераднаціскны склад у словах, у якіх ён ёсць.

Пасля выканання пісьмовага задання настаўнік цікавіцца, пра якія ўласцівасці крапівы расказваецца ў вершы. Прапануе разгледзець малюнкі і расказаць, чым карысная крапіва. *(З крапівы робяць лекі. З маладога лісця крапівы рыхтуюць карысныя і смачныя стравы. Крапіву выкарыстоўваюць як корм для жывёл. З яе робяць шампунь.)*

***Калектыўнае выкананне задання на дошцы.***

Настаўнік запісвае на дошцы словы *крапіва, навіна, фартух, спіна*.

Настаўнік чытае верш «Дзе ставіць націск?» Анатоля Зэкава:

Трэба ведаць так,
Як двойчы два,
Што пад націскам павінны
Вымаўляць мы: **крапіва́**,
**Навіна́**,
**фартý х**
і **спі́на**. [1, с. 25]

Падчас чытання верша настаўнік робіць паўзы перад выдзеленымі словамі, паказвае на адпаведнае слова на дошцы, а вучні хорам дагаворваць. Пры ўзнікненні сумненняў можна прапанаваць вучням звярнуцца да арфаграфічнага слоўніка і праверыць, на які склад падае націск.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 61, практ. 85. Інструктаж аб выкананні дамашняга задання.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Які склад у слове называецца націскным? Якія — ненаціскнымі? Прывядзіце прыклады слоў, у якіх націск падае на першы склад (другі склад, трэці склад).

— Над якімі словамі знак націску звычайна не ставіцца?

— Прывядзіце прыклады слоў, якія адрозніваюцца месцам націску ў беларускай і рускай мовах.

## Урок 18. Націск

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра сэнсаадрознівальную ролю націску; адпрацоўваць уменне правільна вызначаць націскны і ненаціскныя склады ў слове, размяшчаць словы ў алфавітным парадку; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі мэблі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 85.***

— Які склад у слове называецца націскным? Як правільна вызначыць націскны склад?

Праверка дамашняга задання арганізуецца франтальна. Вучні чытаюць словы, вылучаюць голасам націскныя склады. (Пацеркі, маліны, канапа, Паліна. Мішка, шпакі, пліта, Мікіта.) Настаўнік удакладняе, ці ведаюць вучні значэнне слова *пацеркі*. *(Пацеркі — упрыгожанне з невялікіх прадметаў круглай або іншай формы, нанізаных на нітку.)* Настаўнік паказвае малюнак або рэальны прадмет. Вучні тлумачаць правапіс слоў *Паліна*, *Мікіта*.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе двум вучням прачытаць СМС-паведамленне, якое маці даслала Чамучыку (с. 61 вучэбнага дапаможніка).

— Якое слова вы прачыталі па-рознаму? *(Кашы.)* Як вы думаеце, чаму хлопчык разгубіўся? *(Чамучык не ведаў, куды глядзець: у кашу ці ў кошык.)* Што не ўлічыла мама, калі набірала СМС-паведамленне? *(Ад месца націску будзе залежыць сэнс слова.)*

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе, што яны працягваюць вывучаць тэму «Націск». Прапануе вучням сфармуляваць мэты ўрока: «Як вы думаеце, пра што даведаецеся на ўроку? Чаму навучыцеся?»

— Прачытайце праблемнае пытанне на с. 61. Ці можаце вы адказаць на яго?

***Практыкаванне 86.***

Вучні называюць, што бачаць на малюнках. *(Каса, якая ёсць у магазінах. Доўгая каса ў дзяўчынкі. Шматпавярховыя дамы ў горадзе. Прыгожыя дамы гуляюць.)* Асобна вымаўляюць пары слоў, якія адрозніваюцца месцам націскам (*каса — ка́са, дамы — дамы*), вызначаюць націскны склад у кожным слове.

Настаўнік прапануе вучням вусна скласці сказы з гэтымі словамі так, каб стала зразумелым іх значэнне. Адзін сказ са словам *каса* вучні запісваюць (каменціраванае пісьмо).

***Практыкаванне 87.***

Выкананне задання арганізуецца каля дошкі. Вучні запісваюць спалучэнні слоў, каменціруюць заданне, якое выконваюць: графічна абазначаюць націск у выдзеленых словах, падкрэсліваюць націскныя склады. *(Вару ка́шу — кашу́ траву, плачу́ за праезд — плачу ад болю.)*

Выкананне задання завяршаецца вывадам: значэнне выдзеленых слоў залежыць ад месца націску.

***Абмеркаванне зместу рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 62).***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на правільнае вымаўленне слоў з ***о, э*** — пад націскам.

***Практыкаванне 88.***

Вучні разглядваюць малюнак і выказваюць меркаванне адносна таго, пра што пойдзе гаворка ў тэксце, ці бачылі яны калі-небудзь прадмет, адлюстраваны на малюнку. Затым чытаюць тэкст і расказваюць, пра што новае даведаліся.

Арганізуецца прапедэўтычная праца па засваенні правапісу слоў з ***о, э — а***. Настаўнік прапануе знайсці ў тэксце словы з літарамі ***о, э***, вымавіць іх і вызначыць націскны склад.

Затым вучні адказваюць на пытанні:

— Якія назвы мэблі сустрэліся ў тэксце? *(Куфар, стол, ложак, лаўка, шафа.)* Якая мэбля ёсць у вашым пакоі?

Перад выкананнем пісьмовага задання вучні ўспамінаюць алфавіт. Кожнае слова паслядоўна запісваецца на дошцы, вызначаецца націскны склад. *(Ку́фар, ла́ўка, ло́жак, стол, ша́фа.)*

***Выкананне самастойнай работы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем:

> Прачытайце верш.
>
> Хто самы вусаты?
> Запытаўся сом у мамы:
> — Хто ў рацэ вусаты самы?
> Адказала мама:
> — Мы,
> тата, я і ты — самы.
> *Міхась Пазнякоў* [2]
>
> Пастаўце націск у словах. Падкрэсліце словы, якія адрозніваюцца націскам.

Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам самастойна.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 63, практ. 89. Інструктаж аб выкананні дамашняга задання. Настаўнік звяртае ўвагу на афармленне: запісаць сказы трэба ў слупок, як у вучэбным дапаможніку.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Які склад у слове называецца націскным? Як месца націску ўплывае на значэнне слова? Прывядзіце прыклады слоў, значэнне якіх залежыць ад націску.

## Урок 19. Правапіс літар *о, э — а*

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць з асаблівасцямі вымаўлення гукаў [о], [э] ў беларускай мове; фарміраваць уменне правільна вымаўляць словы з гэтымі гукамі і правільна абазначаць іх літарамі на пісьме; адпрацоўваць уменне правільна вызначаць націскны склад у слове; выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку сказы, уменне ажыццяўляць узаемаправерку; развіваць уменне пераказваць тэкст; узбагачаць слоўнікавы запас безэквівалентнай лексікай; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** яблыкі антонаўкі; малюнак, на якім адлюстраваны чаўнок.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 89.***

Праверка задання ажыццяўляецца франтальна. Вучні чытаюць сказы, якія запісалі. Адказваюць на пытанні: Чым адрозніваюцца выдзеленыя словы? *(Націскам.)* На які склад падае націск у гэтых словах? *(Ва́зы — на вазы́, ад стра́ху — пад страху́, ра́кі — з ракі́.)*

Настаўнік цікавіцца, як вучні разумеюць значэнне слова *воз*, паказваюць яго на малюнку.

З мэтай актуалізацыі ведаў настаўнік прапануе ўспомніць, які склад у слове называецца націскным; што вучні ведаюць пра гукі [о], [э]. *(Гэта галосныя гукі. У беларускай мове яны вымаўляюцца пад націскам.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць разважанні Чамучыка на с. 64 у вучэбным дапаможніку і ўспомніць, якія галосныя гукі ў беларускай мове вымаўляюцца толькі пад націскам, якімі літарамі яны перадаюцца на пісьме.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе тэму ўрока: «Правапіс літар ***о, э — а***».

— Як вы думаеце, пра што даведаецеся на ўроку? Чаму навучыцеся?

***Практыкаванне 90.***

Выкананне практыкаванне арганізуецца калектыўна. Вучні па ланцужку запісваюць словы на дошцы з каменціраваннем: вымаўляюць словы, вылучаючы голасам націскныя склады.

— Назавіце галосныя гукі, якія вымаўлялі ў націскных складах. *(Гукі* [о], [э].*)* Якімі літарамі іх трэба абазначыць? *(Літарамі **о, э**.)* Якія літары пішуцца толькі пад націскам? *(Літары **о, э**.)*

Вучні запісваюць словы ў сшытках. Графічна абазначаюць націск у словах.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 65).

— Якія галосныя гукі ў беларускай мове вымаўляюцца толькі пад націскам? Якімі літарамі яны перадаюцца на пісьме? Прывядзіце прыклады слоў з гукамі [о], [э].

***Практыкаванне 91.***

Вучні самастойна суадносяць назву прадмета з малюнкам. Затым арганізуецца калектыўная праверка: вучні паслядоўна называюць адлюстраваныя прадметы. *(Насоўка, бавоўна, коўдра, відэлец, цэгла.)*

Настаўнік прапануе вучням заданне «Адгадайце слова па апісанні»:

✓ Сталовы прыбор у выглядзе ручкі з доўгімі зубамі. *(Відэлец.)*

✓ Будаўнічы матэрыял у выглядзе прамавугольных брускоў з гліны і іншай мінеральнай сыравіны. *(Цэгла.)*

✓ Расліна з насеннем, пакрытым валакном, з якога вырабляецца пража. *(Бавоўна.)*

✓ Невялікая хустачка, прызначаная для выцірання носа або твару. *(Насоўка.)*

✓ Пасцельная рэч, якой накрываюцца. *(Коўдра.)*

Вучань, які адгадвае слова, запісвае яго на дошцы з каменціраваннем, вызначае націск.

Выкананне практыкавання завяршаецца абагульненнем, якое робяць вучні: пад націскам вымаўляем гукі [о], [э] і на пісьме абазначаем іх літарамі ***о, э***.

***Практыкаванне 92.***

Вучні чытаюць словы і вызначаюць, які галосны гук вымаўляецца ў кожным з іх пад націскам. *(Кам*[а]*р, Піл*[і]*п, кукур*[у]*за, цял*[а], *мал*[у]*ю, маш*[ы]*ны.)* Затым настаўнік прапануе адказаць на пытанні:

— Якія галосныя гукі вымаўлялі ў словах пад націскам? *(*[а], [і], [у], [ы].*)* Якія гукі вымаўлялі не пад націскам? *(*[а], [і], [у], [ы].*)* Якія гукі бываюць толькі пад націскам? Прачытайце двухскладовыя словы. *(Камар, Піліп, цяля.)* Прачытайце трохскладовыя словы. *(Малюю, машыны.)* Якое слова засталося? *(Кукуруза.)* Колькі складоў у гэтым слове? *(4.)* Якое слова аднолькава чытаецца ў прамым і адваротным парадку? *(Піліп.)*

Вучні запісваюць двухскладовыя словы, падкрэсліваюць націскныя склады. Тры вучні паслядоўна запісваюць словы на дошцы з каменціраваннем.

***Практыкаванне 93.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць і адгадаць загадку:

Садовыя, мядовыя,
сакаўныя, наліўныя. *(Яблыкі.)*
*Анатоль Клышка* [3, с. 106]

Настаўнік цікавіцца, ці могуць вучні назваць які-небудзь сорт яблыкаў.

Затым вучні выконваюць заданні да практыкавання: дапаўняюць сказы словамі, складзенымі з літар у дужках; размяшчаюць часткі тэксту ў правільнай паслядоўнасці.

— Ці каштавалі вы антонаўкі? Якія яны на смак? *(Гэта кіслыя яблыкі.)*

Настаўнік можа прынесці антонаўкі ў клас, прапанаваць вучням апісаць яблыкі, а на перапынку пакаштаваць іх на смак.

Вучні вызначаюць, пра што расказваецца ў кожнай частцы тэксту, пасля гэтага 2–3 вучні пераказваюць тэкст.

Пасля пераказу тэксту вучні па ланцужку вымаўляюць словы з гукам [о]. *(Апошнія, толькі, антонаўцы, было, восені, антонаўкі, захоўваюцца, гадоў, зімой, восень, пачало, пажоўклае.)* Вызначаюць націскны склад у кожным слове.

Перад запісам слоў пад дыктоўку настаўнік звяртае ўвагу вучняў на форзац 2, арганізуецца абмеркаванне «Алгарытму пісьма пад дыктоўку», вучні ўзнаўляюць паслядоўнасць дзеянняў.

Вучні запісваюць пад дыктоўку настаўніка словы *плады, гадоў, зімой, восень*, падкрэсліваюць націскны склад. Пасля выканання задання вучні абменьваюцца сшыткамі і выконваюць узаемаправерку.

***Практыкаванне 94.***

Вучні чытаюць і адгадваюць загадку.

Настаўнік цікавіцца, значэнне якіх слоў у загадцы яны не зразумелі. Варта ўдакладніць значэнне слова *чаўнок* — дэталь у ткацкім станку, якая мае форму чоўна (лёгкай лодкі); можна паказаць адпаведны малюнак.

Настаўнік задае пытанні: «Якія словы ў загадцы вам падказалі, што адгадкай з'яўляецца маладзік? Разгледзьце малюнак. Што вам нагадвае маладзік?»

Пісьмовае заданне вучні выконваюць самастойна, пасля чаго арганізуецца калектыўная праверка. *(Вячэрняй, чаўнок, сонца, маладзік.)* Вучні тлумачаць правапіс слоў. Звяртаецца ўвага на тое, што літары ***о, э*** пішуцца пад націскам.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 67, практ. 95. Інструктаж аб выкананні дамашняга задання.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія гукі ў беларускай мове вымаўляюцца толькі пад націскам? Прывядзіце прыклады слоў. Якімі літарамі гукі [о], [э] перадаюцца на пісьме?

## Урок 20. Правапіс літар *о, э — а*

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць з асаблівасцямі вымаўлення гукаў [о], [э] — [а] у беларускай мове, правілам правапісу літар ***о, э — а***; адпрацоўваць уменне правільна вымаўляць словы з гукамі [о], [э] у націскных складах, гука [а] замест [о], [э] у ненаціскных складах; развіваць уменні аналізаваць, параўноўваць, устанаўліваць заканамернасць; выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды, цікавасць да вывучэння прыроды роднага краю.

***Абсталяванне:*** карткі са словамі *цэгла, сл..ны, хвост, стр..ляць, хв..сты, плот, ц..гліна, слон, стрэл, пл..ты.*

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 95.***

Арганізуецца калектыўная праверка. Адзін з вучняў чытае прыказку *Сёння зробіш — заўтра як знойдзеш* і тлумачыць, чаму так гавораць. *(Не трэба адкладваць любую справу на потым. Кожную справу трэба рабіць у свой час, потым можна будзе выкарыстаць яе вынікі.)*

Другі вучань тлумачыць правапіс прапушчаных літар у словах: вымаўляе слова, выдзяляючы голасам націскны склад, называе гук, які вымаўляцца пад націскам, і літару, якой яго трэба абазначыць на пісьме. *(Зробіш, знойдзеш.)* Вучні прыгадваюць, што ***о*** у беларускай мове заўсёды пішацца пад націскам.

Настаўнік задае пытанне: «Якая літара яшчэ пішацца пад націскам?» *(Літара* ***э****.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць гісторыю, якая адбылася з Чамучыкам (чытае праблемную сітуацыю на с. 67 у вучэбным дапаможніку). Далей арганізуецца гутарка па пытаннях: «Што здзівіла Чамучыка? Чаму ён задумаўся? *(У слове* цэны *вымаўляем гук* [э], *а ў слове* цана *— гук* [а].*)* Што вы адказалі б Чамучыку?

Настаўнік прапануе вучням прачытаць праблемнае пытанне на с. 67 (Што адбываецца з гукамі [о], [э] не пад націскам?), высвятляе, ці могуць яны адказаць на гэта пытанне.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— Сёння на ўроку мы знойдзем адказ на гэта пытанне. Мы працягваем вывучаць тэму «Правапіс літар ***о, э — а***».

***Практыкаванне 96.***

Вучні чытаюць словы, аб'ядноўваюць іх у пары з улікам узаемасувязі па значэнні. *(Голас — галасы, стрэхі — страха, дрэва — драўляны, мора — марскі.)* Запіс кожнай пары слоў суправаджаецца каменціраваннем. У словах вызначаецца націскны склад (арганізуецца графічнае абазначэнне націску ў словах). Вучні называюць, які гук вымаўляецца не пад націскам на месцы [о] або [э] і якой літарай ён абазначаны. Адпаведныя літары можна падкрэсліць.

Завяршаецца выкананне практыкавання абагульненнем, якое робяць вучні: «На месцы гукаў [о], [э] не пад націскам вымаўляецца гук [а]. На пісьме ён перадаецца літарай ***а***».

Настаўнік прапануе пераканацца ў правільнасці зробленага вываду і паслухаць правіла.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 68).

— Ці правільны вывад мы зрабілі? Калі пішуцца літары ***о, э***? Якая літара пішацца замест іх у ненаціскных складах?

Настаўнік прапануе вучням разгледзець форзац 2 і расказаць правіла правапісу ***о, э — а*** з апорай на схему.

***Практыкаванне 97.***

Вучні чытаюць словы і вызначаюць, які гук вымаўляецца ў першым складзе кожнага слова, якой літарай яго трэба абазначыць. *(Горы, рэкі, воды, цэны.)* Настаўнік прапануе вучням змяніць словы так, каб яны называлі адзін прадмет. Заданне выконваецца з каменціраваннем: вучань называе слова, вызначае гук, які вымаўляецца на месцы [о] або [э], і літару, якой яго трэба абазначыць. Слова запісваецца на дошцы. *(Гара, рака, вада, цана.)*

***Практыкаванне 98.***

Выкананне задання пачынаецца з разгляду і аналізу схемы: устанаўленне правільнай паслядоўнасці дзеянняў для вызначэння правапісу ***о, э — а***. Да гэтай схемы вучні могуць звяртацца і пры выкананні іншых практыкаванняў па тэме.

Карыстаючыся схемай, вучні вызначаюць, якую літару трэба запісаць у словах. Першыя два словы вучні каменціруюць услых для ўсяго класа. *(Горад, гарады.)* Затым арганізуецца работа ў парах з астатнімі двума словамі: вучні расказваюць адзін аднаму. *(Цэгла, цагляны.)* Можна прапанаваць запісаць словы.

***Практыкаванне 99.***

Настаўнік прапануе вызначыцца, хто будзе «пілотам», а хто — «касманаўтам». Вучні разглядваюць малюнкі, называюць адлюстраваныя прадметы. Вызначаюць, які гук вымаўляецца ў словах пад націскам, а які на яго месцы не пад націскам.

Тры вучні запісваюць словы на дошцы, астатнія вучні — у сшытках. Затым арганізуецца калектыўная праверка выкананага задання. *(Совы — сава, стрэлы — страла. Дамы, насы.)*

***Практыкаванне 100.***

Вучні разглядваюць малюнак і называюць, што бачаць. Настаўнік прапануе вучням прачытаць тэкст, дапаўняючы патрэбнымі словамі. Вучні самастойна запісваюць словы, якімі дапаўнялі тэкст. *(Дарога, поле, каласы, рака, мост, паляна.)* Праверка выканання задання арганізуецца франтальна. Вучні каменціруюць напісанне слоў.

— Раскажыце, ці хадзілі вы ў паход. З кім? Калі гэта было? (Выслухоўваюцца вусныя расказы вучняў.)

***Выкананне задання «Аб'яднайце словы ў пары».***

Варыянт 1. Работа арганізуецца з усім класам. На дошцы вывешваюцца карткі на магнітах са словамі:

цэгла | стр..ляць | слон | стрэл

сл..ны | пл..ты | хв..сты

плот | хвост | ц..гліна

Настаўнік прапануе аб'яднаць словы ў пары. Вучні выходзяць да дошкі, перамяшчаюць карткі, тлумачаць правапіс слоў і маркерам дапісваюць прапушчаныя літары.

Варыянт 2. Рыхтуецца камплект картак са словамі для работы ў парах. Пасля выканання задання арганізуецца франтальная праверка.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 70–71, практ. 101. Інструктаж аб выкананні дамашняга задання.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Прыгадайце гісторыю пра Чамучыка, якую сёння мы чыталі? Што вы адказалі б хлопчыку па пытанне: «Чаму мама сказала *цАна*, а ў аб'яве напісана *цЭны*?»

## Урок 21. Правапіс літар *о, э — а*

***Мэты ўрока:*** пазнаёміць са словамі, у якіх літара ***э*** захоўваецца не пад націскам; адпрацоўваць правіла правапісу літар ***о, э — а***; адпрацоўваць уменні правільна вызначаць націскны склад у слове, адрозніваць галосныя гукі, размяшчаць словы ў алфавітным парадку; развіваць уменне працаваць з арфаграфічным слоўнікам, уменне аналізаваць, аб'ядноўваць словы ў пары па самастойна вызначанай прымеце; пазнаёміць са слоўнікавым словам *экскурсія*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне, фантазію; выхоўваць цікавасць да вывучэння роднага краю, жаданне падарожнічаць.

***Абсталяванне:*** арфаграфічны слоўнік; карткі са складамі слоўнікавага слова; картка са слоўнікавым словам *экскурсія*; рэкламныя буклеты для падарожнікаў; фотаздымкі возера Нарач, берагоў Нарачы; карткі са схемай «Прапавіс ***о, э — а***».

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Перад праверкай дамашняга задання настаўнік раздае вучням карткі са схемай і прапануе запоўніць пропускі: успомніць паслядоўнасць дзеянняў для вызначэння напісання літар ***о, э, а***. Затым арганізуецца калектыўная праверка выкананага задання.

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю ________.

Пад ________ пішу ***о, э***.

Не пад ________ на месцы ***о, э*** пішу ___.

***Практыкаванне 101.***

Арганізуецца ўзаемаправерка выкананага дамашняга задання з апорай на ўзор на дошцы. *(Рэ́чка, ракá, рачны́. Маро́з, маразы, маро́зны.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік адзначае, што яны працягваюць вывучэнне тэмы мінулых заняткаў, будуць адпрацоўваць напісанне слоў з літарамі ***о, э — а***.

***Практыкаванне 102.***

Вучні дапаўняюць спалучэнні слоў патрэбнымі словамі, тлумачаць іх правапіс. *(Высокая сасна, глыбокая нара, вострая каса, прыгожыя косы, доўгія стрэлы.)* Першыя тры спалучэнні слоў запісваюцца на дошцы, два апошнія — вучні запісваюць самастойна, пасля чаго арганізуецца франтальная праверка.

***Практыкаванне 103.***

Спачатку работа арганізуецца ў парах. Вучні аб'ядноўваюць словы ў пары. Настаўнік высвятляе, па якой прымеце аб'ядноўвалі словы. *(Словы звязаны па сэнсе, у словах замест **о, э** не пад націскам пішацца **а**.)* Пры праверцы задання адзін вучань называе слова з ***о*** або ***э*** пад націскам, а другі — слова, якое падабралі да яго. *(Шэпт — шаптаць, козы — каза, пчолы — пчала, стог — стагі, шоўк — шаўковы.)*

— Якія словы засталіся без пары? *(Рэцэпт, інтэрнэт.)* Вызначце націск у гэтых словах. Што вы заўважылі? (Вучні адзначаюць, што літара ***э*** захоўваецца ў першым складзе перад націскам.)

Настаўнік прапануе запісаць словы ў сшытак, паставіць націск, падкрэсліць ***э*** ў першым пераднаціскным складзе.

Настаўнік тлумачыць, што ў беларускай мове ёсць словы, напісанне якіх не падпарадкоўваецца правілу правапісу ***о, э — а***, і з некаторымі такімі словамі яны сёння пазнаёмяцца.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 72).

— У якіх словах літара ***э*** пішацца не пад націскам? Прывядзіце прыклады такіх слоў. Да якога слоўніка трэба звярнуцца, каб удакладніць напісанне слоў?

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік вывешвае на дошцы карткі са складамі і прапануе размясціць іх так, каб атрымалася слоўнікавае слова.

кскур

я

сі

э

— Як вы разумееце значэнне слова *экскурсія*? *(Наведванне чаго-небудзь, паездка, прагулка кудынебудзь з пэўнай мэтай.)* Дзе вы былі на экскурсіі апошні раз? Куды хацелі б паехаць ці пайсці на экскурсію?

— Вымавіце слова *экскурсія*. Вымавіце слова па складах. *([э-скур-с'і-й'а].)* Колькі складоў у гэтым слове? *(4.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На другі склад —* [скур].*)* Ці супадае колькасць літар і гукаў у слове? *(Гукаў больш, чым літар. Літара **я** абазначае два гукі —* [й'а].*)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам:

экску́рсія

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Акцэнтуецца ўвага на тым, што ў першым складзе перад націскам захоўваецца літара ***э***.

Настаўнік прапануе вучням запісаць у сшытак слова *экскурсія*, паставіць націск, падкрэсліць ***э*** ў першым складзе.

Адпрацоўваецца напісанне аднакаранёвых слоў. Настаўнік запісвае на дошцы словы *экскурсант*, *экскурсавод* і прапануе вучням растлумачыць іх значэнне. *(Экскурсант — удзельнік экскурсіі. Экскурсавод — той, хто паказвае выстаўленыя для агляду экспанаты і суправаджае паказ неабходнымі тлумачэннямі.)* Акцэнтуецца ўвага на захаванні літары **э** ў словах у ненаціскным складзе.

— Запішыце словы *экскурсант, экскурсавод*. Падзяліце іх на склады. Вызначыце націск у гэтых словах. Падкрэсліце літару **э**.

Вучні складаюць сказ з новым слоўнікавым словам. Адзін сказ запісваюць з каменціраваннем (на выбар настаўніка).

**5. Этап замацавання вывучанага матэрыялу.**

***Практыкаванне 104.***

Вучні чытаюць словы, вызначаюць націск, удакладняюць іх напісанне па арфаграфічным слоўніку.

— Да якога вываду вы прыйшлі? Якая літара пішацца ў кожным слове ў ненаціскным складзе?

Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка ўзнаўляюць алфавіт. Пры неабходнасці звяртаюцца да форзаца 1 вучэбнага дапаможніка.

Затым выкананне задання арганізуецца каля дошкі. Вучні запісваюць словы ў алфавітным парадку, ставяць націск, падкрэсліваюць устаўленую літару. Каля дошкі працуюць розныя вучні: той, хто першым вызначае слова, якое павінна ісці ў алфавітным парадку. *(Аэрапорт, ветэран, ордэн, рэклама, тэлевізар, экскурсія.)*

Пасля запісу слоў вучні аб'ядноўваюць словы ў групы па самастойна вызначанай прымеце і аргументуюць свой выбар. Магчымы розныя варыянты групоўкі слоў, напрыклад адзін з іх: *рэклама, тэлевізар, аэрапорт, экскурсія*; *ветэран, ордэн*. Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка прыдумваюць тэкст, выкарыстоўваючы словы адной з груп. Выкананне гэтага задання можна арганізаваць у групах.

***Практыкаванне 105.***

Настаўнік цікавіцца ў вучняў, ці бачылі яны калі-небудзь рэкламныя буклеты, можа паказаць, як яны выглядаюць. Настаўнік звяртаецца да вучняў са словамі: «Уявіце, што вы ўдзельнічаеце ў распрацоўцы рэкламнага буклета. Дапоўніце яго першую старонку патрэбнымі словамі».

Вучні выразна чытаюць інфармацыю са старонкі буклета; тлумачаць, якія словы ў апошнім сказе запісаны з вялікай літары і чаму. Звяртаецца ўвага на знак прыпынку ў канцы сказа. Кожны вучань самастойна запісвае апошні сказ, у слоўнікавым слове ставіць націск і падкрэслівае літару галоснага гука ў першым пераднаціскным складзе.

Пасля выканання пісьмовага задання арганізуецца работа па развіцці звязнага вуснага маўлення. Настаўнік можа звярнуцца да вучняў з наступнымі пытаннямі: «Куды запрашае падарожнікаў буклет? Куды можна паехаць на экскурсію, каб убачыць зубра? Як пра гэта можна расказаць у буклеце? Што вы бачыце на малюнку справа? Дзе знаходзіцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі? Што вы напісалі б у рэкламным буклеце пра яе?»

Пры неабходнасці настаўнік можа нагадаць вучням, пра што яны даведаліся ў гэтым навучальным годзе на ўроках беларускай мовы (пра Нацыянальную бібліятэку Беларусі — с. 28, самую знакамітую елку ў Белавежскай пушчы — с. 38).

Настаўнік паведамляе вучням, што сёння яны віртуальна наведаюць адно маляўнічае месца Беларусі, а для гэта ім неабходна разгадаць рэбус на дошцы:

 Ч

*(Нарач.)*

Настаўнік цікавіцца, што вучні ведаюць пра возера Нарач.

***Практыкаванне 106.***

Вучні чытаюць тэкст, пасля чаго расказваюць, пра што новае яны даведаліся. Настаўнік можа прад'явіць фотаздымкі Нарачы. Дадаткова вучням можна задаць пытанні: «Як вы думаеце, чаму Нарач называюць беларускім морам? А чаму жамчужынай? Ці адпачывалі вы калі-небудзь на Нарачы? Што бачылі на возеры?»

Выкананне пісьмовага задання можна арганізаваць наступным чынам: вучань называе слова з літарай **о**, змяняе яго і запісвае на дошцы. Астатнія вучні запісваюць слова ў сшытках. Такім чынам арганізуецца запіс кожнага слова. *(Азёры, маркі, вада, вадзіцца, сасна.)* Да дошкі выклікаюцца розныя вучні. Звернем увагу: змяніць форму слова *мора* так, каб замест **о** пісалі **а**, не магчыма. Вучні могуць падабраць аднакаранёвае слова (без паведамлення тэрміна) — *марскі*.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 74, практ. 107. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што верш трэба запісаць у слупок, як у вучэбным дапаможніку.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якая літара пішацца ў словах замест **о**, **э** не пад націскам? Прывядзіце прыклады слоў, у якіх літара **э** захоўваецца ў ненаціскных складах.

*Працяг будзе.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Зэкаў, А. М.* Лічба з літарай сябруюць: ПРАВІЛьныя вершы, загадкі-задачкі : для мал. шк. узросту / А. М. Зэкаў. — Мінск : Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016. — 48 с.
2. *Пазнякоў, М. П.* У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў ; маст. С. Волкаў. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009. — 144 с.
3. *Клышка, А. К.* Прыгаршчы языкаломак / А. К. Клышка. — Мінск : Нар. асвета, 2011. — 31 с.


**Крыніцы ілюстрацый:**


https://pickimage.ru/wp-content/uploads/images/detskie/mint/myata7.jpg;
https://pm1.narvii.com/7274/a5fc2ce4c677b841ea4f042205d4e709c765aebar1-1280-960v2_hq.jpg